PolotskSU



# *ИСТОРИЯ*

**УДК 94 (476)**

## АБШЧЫНА Ў ДЗЯРЖАЎНЫХ УЛАДАННЯХ УСХОДА БЕЛАРУСІ Ў XVI – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVII СТАГОДДЗЯ

***канд. гіст. навук В.Ф. ГОЛУБЕЎ***
***(Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск)***

*Даследуецца абшчына як форма сялянскай самаарганізацыі ў Падзвінскіх і Падняпроўскіх гаспадарскіх валасцях у XVI – першай палове XVII стагоддзя. Дэталева разглядаецца роля сялянскай абшчыны ў грамадскім і гаспадарчым жыцці беларускай вёскі; адзначана месца старца ў сістэме сельскага самакіравання. Паказана, што значныя асаблівасці сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця ўсходняга рэгіёну Беларусі паўплывалі на палітыку ўладаў адносна насельніцтва дзяржаўнай вёскі, затармазілі працэсы індывідуалізацыі сялянскіх гаспадарак. У дзяржаўных уладаннях усхода Беларусі сельская (валасная) абшчына не толькі захавалася як форма сялянскага самакіравання, але і стала асноўным інстытутам, праз які ажыццяўляліся адносіны феадальна-залежнага насельніцтва з дзяржавай у павіннаснай і сацыяльнай сферах.*

**Уводзіны.** Развіццё чалавечага грамадства, фарміраванне нацыянальных асаблівасцей, менталітэту таго ці іншага народа ў многім звязана са з'яўленнем і функцыянаваннем такога сацыяльна-гаспадарчага інстытута, як абшчына (грамада). Чалавек вылучыўся з жывёльнага свету якраз у якасці істоты сацыяльнай, калі аб'яднаўся ў калектыў разам з сабе падобнымі, і людзі разам пачалі змагацца за сваё існаванне. З цягам часу формы абшчыннай арганізацыі мяняліся – ад першабытна-родавай абшчыны з калектыўнай уласнасцю да суседскай, тэрытарыяльнай з сямейна-індывідуальнай уласнасцю. У феадальную эпоху абшчына ўяўляла сабой даволі складаны грамадска-вытворчы механізм. Яна з'яўлялася арганізацыяй, якая прадстаўляла сялянства ў адносінах з землеўласнікамі і дзяржавай, існавала як адносна самастойны адміністрацыйна-прававы інстытут, якому належалі значныя павіннасныя, судовыя, гаспадарчыя і іншыя паўнамоцтвы. Што вызначала даволі моцныя пазіцыі сельскай абшчыны ў дзяржаўнай вёсцы на ўсходзе Беларусі ў акрэслены перыяд, чаму тут яе месца і роля ў жыцці грамадства былі больш значнымі, чым на захадзе і ў цэнтры – гэтыя пытанні з'яўляюцца аднымі з галоўных у дадзеным даследаванні.

**Асноўная частка.** У канцы XV – XVI стагоддзяў на ўсходзе Беларусі ў асноўным пераважала дзяржаўнае землеўладанне. Як адзначаў У.І. Пічэта: «Калі ў заходняй частцы Беларусі гаспадарскія землі перамяжоўваліся з прыватнаўласніцкімі, то на Беларусі ўсходняй у XV і ў пачатку XVI стстагоддзя ўся зямельная тэрыторыя была велікакняжацкай» [1, с. 360]. У гэтым сцвярджэнні было перабольшванне. На ўсходзе Беларусі існавалі не толькі гаспадарскія, але таксама прыватнаўласніцкія і царкоўныя маёнткі. Але праўда ў тым, што дзяржаўнае землеўладанне ў гэты час пераважала ў структуры феадальнага землеўладання ва ўсім Вялікім княстве Літоўскім, і на тэрыторыі Беларусі ў тым ліку. Так, толькі дамен Вялікага князя Літоўскага ў сярэдзіне XVI стагоддзя займаў амаль палову тэрыторыі краіны [2, с. 52]. А на ўсходзе сапраўды большасць маёнткаў належалі дзяржаве ці асабіста гаспадару. Зразумела таму, што гаспадарчая і сацыяльная палітыка, якая праводзілася ў дзяржаўных уладаннях, значным чынам уплывала на характар развіцця ўсяго рэгіёну.

Больш за тое, можна сцвярджаць, што вызначальны ўплыў на развіццё эканомікі і на сацыяльнае становішча насельніцтва ўсходу Беларусі аказвалі вялікакняжацкія (гаспадарскія) уладанні, размешчаныя ў двух важнейшных гаспадарча-тэрытарыяльных рэгіёнах дзяржавы – Падзвінні і Падняпроўі. Дакладна вызначаных межаў гэтых рэгіёнаў не існавала. Вядома, што Падзвінне займала тэрыторыю, якая ў асноўным знаходзілася ў сярэднім і верхнім басейне Заходняй Дзвіны, на поўнач ад Лагойска і Барысава да паўночных і ўсходніх межаў Беларусі. У раёне верхняга цячэння Бярэзіны адбываўся паступовы пераход земель Падзвіння ў Падняпроўскія тэрыторыі. Падняпроўе ахоплівала землі ў басейне верхняга Дняпра, яго прытокаў: Сажа, Друці, а таксама ў верхнім цячэнні Бярэзіны.

Гэтыя землі з даўніх часоў мелі значныя сацыяльныя і палітычныя асаблівасці свайго становішча ў ВКЛ. Падзвінне было галоўнай часткай тэрыторыі старажытнай Полацкай зямлі, а пазней стала асновай Полацкай і Віцебскай земляў, якія ўвайшлі ў ВКЛ на правах аўтаномій [3, с. 372].

У XVI стагоддзі на тэрыторыі Падзвіння размяшчаліся гаспадарскія Падзвінскія валасці: Абалецкая, Азярыцкая (Езярышчанская), Браслаўская, Віцебская, Дзісенская, Друйская, Дрысвяцкая, Опеская (Опская), Полацкая, Укольская, Усвяцкая і інш. Больш шырокія правы, у адрозненне ад іншых рэгіёнаў ВКЛ, мела тут не толькі шляхта, а і людзі простага стану, сяляне, якія жылі ў дзяржаўных уладаннях і выконвалі спецыяльныя службы, звязаныя ў першую чаргу з абаронай краіны. Сярод гэтых правоў вылучалася

PolotskSU


права простага насельніцтва на захаванне ўласнай самаарганізацыі, права самім збіраць і аддаваць дзяржаве чынш і даніны, чаго ўжо не было ў дзяржаўных уладаннях захада і цэнтра Беларусі, права сельскіх абшчын падаваць скаргі на імя кіраўніка дзяржавы і інш. Падобнымі правамі валодала таксама сельскае насельніцтва, якое пражывала ў гаспадарскіх Падняпроўскіх воласцях (Аршанскай, Бабруйскай, Барысаўскай, Бярэзінскай, Брагінскай, Бчыцкай (Пціцкай), Гомельскай, Горвальскай, Дубровенскай, Крычаўскай, Любашанскай, Магілёўскай, Мазырскай, Прапойскай, Рэчыцкай, Свіслацкай, Чачэрскай і інш.) [4, с. 188; 5, с. 28; 6, с. 62]. Хаця Падняпроўе гаспадарча не было напрамую звязана з Падзвіннем, гэтыя рэгіёны мелі некаторыя агульныя рысы ў сацыяльна-эканамічным развіцці.

Архіўныя дакументы яскрава сведчаць, што на палітычнае і сацыяльна-эканамічнае становішча ўсходніх зямель Беларусі ў часы Вялікага княства Літоўскага карэнным чынам уплывала іх пагранічнае становішча з Маскоўскай дзяржавай. У той час, калі на астатняй тэрыторыі ВКЛ спрабавалі правесці змены, у тым ліку і ў сферы гаспадарчай, сацыяльнай і тэрытарыяльнай арганізацыі насельніцтва, на ўсходзе і прылягаючых тэрыторыях улады паступалі больш кансерватыўна, улічваючы як мясцовыя традыцыі, так і дзяржаўныя патрэбы. Асабліва такая тэндэнцыя праявілася ў 20 – 50-я гады XVI стагоддзя, калі ў першую чаргу ў дзяржаўных уладаннях усхода краіны не была праведзена аднастайная з іншымі рэгіёнамі ВКЛ рэарганізацыя эканамічнага і сацыяльнага жыцця насельніцтва, распачатая на захадзе і ў цэнтры краіны адначасова з валочнай памерай. У гаспадарскіх уладаннях усходу Беларусі ў 1560 – 1561 гады была праведзена палавінчатая рэформа, так званае «параўнанне грунтаў і платаў». На ўсходзе толькі ў дзяржаўных гарадах землі былі перамераны на валокі і ўстаноўлены выплаты з іх у адпаведнасці з «Уставай на валокі» ад 1 красавіка 1557 года. У сельскіх Падняпроўскіх і часткова ў Падзвінскіх валасцях было зроблена, і то далёка не скрозь, прыблізнае «параўнанне грунтаў» праз увядзенне ці замацаванне там у якасці зямельнага надзела і адзінкі падаткавага і павіннаснага абкладання, прыблізна роўнага валоцы – службы [7, с. 53 – 55]. Да таго ж, нават службы былі ўведзены не ва ўсіх дзяржаўных уладаннях Падзвіння і Падняпроўя. Так, напрыклад, у першай палове XVII стагоддзя і пазней у валасцях Любашанскага староства ў Падняпроўі існаваў «звычай у той маёмасці, што грунты падданым раздаюцца і вымяраюцца не валокамі, а пудамі і бязменамі, як бязменаў шэсць – то пуд, як быццам то (jako by to) валока» [28, Sign. 143, p. 29]. Разам з тым у вёсцы Божын суседняга маёнтка Божына, дзе зямельны надзел таксама называўся «пуд», інвентар 1635 года называе «w nim Pomiar 23 co czyni Pudow 92» [28, Sign. 143, p. 33]. Хутчэй за ўсё на такую сацыяльна-эканамічную палітыку ўладаў ВКЛ паўплывалі войны з Маскоўскай дзяржавай, асноўнай арэнай ваенных дзеянняў якіх, ад канца XV па канец XVI стагоддзя, стала Паддзвінне і часткова Падняпроўе (1492 – 1494; 1500 – 1503; 1507 – 1508; 1512 – 1522; 1534 – 1537; 1558 – 1583 гг.).

Аднолькавым у гаспадарчым жыцці Падняпроўя і Падзвіння было тое, што аснову феадальнай рэнты, якая збіралася з залежнага насельніцтва гэтых рэгіёнаў, складалі чынш і даніна розных відаў, прычым натуральныя выплаты пераважалі. Да канца XVI стагоддзя ў абшчынах гаспадарскіх Падняпроўскіх і Падзвінскіх валасцей пераважалі сяляне-даннікі. Як адзначаў М.К. Любаўскі, «Сапраўднае царства сялян-*даннікаў* уяўлялі сабой так званыя Задзвінскія воласці, якія знаходзіліся ў Віцебскай зямлі, Падняпроўскія воласці па сярэдняму Дняпру, Бярэзіне і Сажу і іх прытоках, Северскія воласці па Дзясне, Сейму і Суле, а таксама і Кіеўскія» [8. с. 94].

На высокую ўдзельную вагу даніны і грашовых выплатаў у структуры сялянскіх павіннасцяў, магчыма, паўплывала тое, што на ўсходзе Беларусі размяшчаўся шэраг умацаваных крэпасцяў як дзяржаўных (Азярышча, Бабруйск, Барысаў, Браслаў, Віцебск, Гомель, Дрысвяты, Крычаў, Любашаны, Магілёў, Мсціслаў, Орша, Полацк, Прапойск, Радамль, Рэчыца, Чачэрск), так і прыватнаўласніцкіх (Баркалабава, Бялынічы, Быхаў, Галоўчын, Горы, Друцк, Дуброўна, Копысь, Круглае, Смальняны, Цяцерын, Шклоў, Усвяты), гарнізоны якіх трэба было забяспечыць правіянтам, фуражом, грашыма.

Дзяржава вельмі ўважліва адносілася да таго, каб замкі (у тым ліку і прыватнаўласніцкія) былі ў добрым стане, а ваяры накормленыя і забяспечаныя ўсім неабходным. Пра гэта яскрава сведчыць ліст вялікага князя Жыгімонта да «усіх князёў Друцкіх», датаваны 1526 годам, дзе загадвалася: «аж бы вы замок заробили у во Друцку как же того замку потреба великая указуеть на том местцу мети для обороны земское и замыканям дорогам от неприятелей наших у панство наши Великое князство Литовское, а звлаща от великого кн/я/зя Московского, бо естли бы он хотел з нами перемирье взрушити тогды перьвыи мел бы приити на тыи вкраины наши и, его ж боже вховай, тогды бы вам, подданым нашим, без того замку немалая шкода была, прото приказуем вам аж бы есте тот замок у во Друцку людми своими долници вои заробили потому как и перед тым есте робливали…» [9, Sign. 296, p. 1].

Вышэйшая ўлада вельмі ўважліва клапацілася пра ахову і абарону памежных з Маскоўскай дзяржавай тэрыторый, сачыла за тым, каб замкі і крэпасці былі дагледжаныя і хапала людзей на іх ахову. Традыцыйна адным з абавязкаў насельніцтва гаспадарскіх валасцей былі работы па ўмацаванню таго ці іншага пагранічнага замка. Звычайна такія работы ўскладваліся цалкам на валасную грамаду. І нават калі з тэрытарыяльнай грамады «выпадалі» некаторыя двары ці вёскі ў выніку падараванняў іх вялікім князем прыватным уласнікам, да ўводу ў дзеянне Статута ВКЛ 1566 года вядома шмат фактаў, калі людзі заста-

PolotskSU



валіся абавязанымі «службай замкавай». Так было ў 1528 годзе ў Мазырскай воласці, дзе перададзеныя прыватным феадалам былыя дзяржаўныя сяляне разам з мяшчанамі і валашчанамі распраджэннем вялікага князя абавязаны былі замкавай работай, дзяклам і грошамі на замак [10, с. 15]. Грамадой на чале са старцам павінны былі выходзіць на замкавыя работы «падчас будовы новага замку, рамонту паркана і ўсякай работы замкавай» і сяляне Бабруйскай воласці паводле Уставы 1621 года [11, p. 547]. Але і сяляне, і гараджане пры любой мажлівасці імкнуліся пазбегнуць гэтай цяжкай і працяглай па часу працы. Звычайна адмаўляліся ад такіх работ усёй абшчынаю, так людзям было прасцей бараніць свае інтарэсы ў змаганні з дзяржаўнай сістэмай. Яскравым прыкладам такога супольнага змагання могуць паслужыць падзеі першай паловы XVII стагоддзя ў Азярыцкім (Езярыцкім) старостве Віцебскага ваяводства. Як сведчаць дакументы, з нейкіх прычын (па ўскосных сведчаннях гэта хутчэй за ўсё значна павялічаная колькасць дзён працы на замкавай рабоце паводле загаду Азярыцкага старасты) цэлыя сельскія абшчыны і асобныя жыхары (баяры і простыя сяляне) пачалі адмаўляцца ад цяжкай працы па рамонту і адбудове Азярыцкага замка. Баяры, да таго ж, адмовіліся і ад самых земляных работ і ад нясення службы па ахове замка.

Сітуацыя некалькі разоў разбіралася на дзяржаўным узроўні, а сама справа доўжылася з 1613 па 1646 год. На тое, што «дей боярове и подданые… избегают чинить замок наш тамошний украинный» канцлеру ВКЛ у 1613 годзе паскардзіўся Азярыцкі староста князь Крыштаф Друцкі-Сакалінскі [12. Dz. X, sign. 304, p. 1]. У адказ на гэта 3 жніўня 1613 года Л. Сапега выслаў ліст да насельніцтва і ўраднікаў Полацкага і Віцебскага ваяводстваў, у якім заявіў, што ў цяперашні небяспечны час замак «не может и в небеспеченстве явном от неприятеля зостават», і папярэдзіў усіх, каб збеглых «своволных бояр и подданых наших озерицких до именей своих также до мест наших не приймовали а ни их укрывали и охраняли» [12. Dz. X, sign. 304, p. 1].

Але жыхары Азярыцкага староства не сталі выконваць распараджэнне канцлера ВКЛ. Непадпарадкаванне ўладам пашыралася, і ў справу ўмяшалася першая асоба краіны. Як адзначалася ў лісце караля Уладзіслава IV, адпраўленага 9 студзеня 1634 года з Багданавай аколіцы з-пад Смаленска, на яго думку, на тэрыторыі Азярыцкай воласці ўзнік сапраўдны «бунт», які ініцыіравалі і ўзначалілі баяры гэтай воласці. Уладзіслаў, звяртаючыся да баяраў Азярыцкай воласці, якраз спасылаўся на існуючую ў гэты час «небяспеку ад масквіціна» [12. Dz. X, sign. 304, p. 12]. Баяры абвінавачваліся не толькі ў тым, што адмаўляліся служыць у замку, але і ў тым, што жылі незалежнай і непадкантрольнай ад улад абшчынай, кіраваліся сваімі нормамі: «старца і дзесятнікаў прызначаных… панам кашталянам полацкім скідваеце, а самі іншых самаўладна ставіце і розныя бунты робіце» [12. Dz. X, sign. 304, p. 12]. Непадпарадкаванне, а тым больш стварэнне непадкантрольнай ад уладаў грамадскай структуры, беспакараным для падданых прайсці не магло. Ды й кароль адназначна загадаў выконваць баярскую службу, слухацца пастаўленых ураднікамі старца і дзесятнікаў і чакаць разбора іх справы.

Але, як сведчаць крыніцы, нежаданне працаваць на будаўніцтве замка пастунова ахоплівала ўсё большую колькасць вёсак Азярыцкай воласці, салідарнасць з баярамі выказвала ўсё больш і больш сельскага насельніцтва. Копіі каралеўскіх лістоў аб прыцягненні сялян воласці для замкавых работ развозіліся па воласці судовымі выканаўцамі (вознымі), перадаваліся трымаўцам ці кіраўнікам сялянскіх абшчын. Але і ў гэтых выпадках каралеўскія распараджэнні часта не выконваліся. Так, выпіс з гродскіх кніг Віцебскага ваяводства ад 2 мая 1642 года сведчыў аб тым, што судовы выканаўца Полацкага ваяводства Ян Мастра 26 красавіка 1642 года адвёз у дзяржаўную вёску Азярыцкай воласці Церабежаны (Теробежаны) ліст да трымаўцы вёскі «о памаганні і будаванні замку Азярыцкага», які ліст пакінуў у старца вёскі «на імя Івана Скаварады ў ізбе» [12. Dz. X, sign. 308, p. 8]. Сведчанняў пра тое, што сяляне пачалі ўдзельнічаць у гэтым «памаганні», дакумент не ўтрымлівае.

1 чэрвеня 1644 года Уладзіслаў IV выдаў адмысловую грамату, адрасаваную «баярам і ўсім падданым староства нашага Езярыцкага», у якім між іншым утрымліваецца важная інфармацыю аб грамадскім становішчы ў рэгіёне. Аказваецца, вялікая колькасць насельніцтва не толькі адмовілася выконваць папярэдняе распараджэнне караля і палажэнні Уставы, якую выдалі прыехаўшыя ў воласць каралеўскія камісары, але і пачалі выстаўляць нейкія ўласныя прэтэнзіі і патрабававнні, накіраваныя ў першую чаргу супраць старасты замка. Больш таго, бунтаўшчыкі ўсяляк пагражалі замкаваму падстарасту і, як сказана ў тэксце, «дзесятнікаў, заказнікаў і тых падданых, якія памочнікамі ў тых бунтах быць не хочуць, білі» [12. Dz. X, sign. 308, p. 10].

Некалькіх падданых, якіх улады прысудзілі да выгнання з воласці, насельніцтва перахоўвала па вёсках і не выдавала ўраднікам. Верагодна, пагроза выгнання са сваёй воласці, са сваёй абшчыны была ў той час дастаткова рэальным пакараннем для сельскіх жыхароў. Тым не менш ніхто па добрай волі ў тыя часы сваю абшчыну не пакідаў. (Мы свядома не гаворым пра ўцёкі злачынцаў, лайдакоў і г.д., якія свядома выстаўлялі сябе па-за межы вясковых правіл, традыцый і норм грамадскага жыцця). Сапраўды, збегі селяніна са сваёй вескі былі дастаткова рэдкімі і, як правіла, вымушанымі. Простаму чалавеку было вельмі складана ўвайсці ў новую абшчыну, члены якой звычайна насцярожана, а то і варожа адносіліся да чужакоў. Стаць нароўні з вясковымі «мужамі» звычайна не ўдавалася прадстаўнікам першага пакалення ўцекачоў. У крыніцах маецца шмат фактаў, калі феадал засцярагаў валашчанаў, ці сялян, ад дыскрымінацыі новых жыхароў – слабажанаў, прыхадняў, новікаў старажылаў. Збегі, калі іх толькі не

PolotskSU



вывеў да сябе чужы пан, вымушаны былі паўлегальна жыць у новых для сябе вёсках-абшчынах у якасці падсуседкаў, кутнікаў, у лепшым выпадку сяброў ці прымакоў. На новым месцы ў межах сельскай абшчыны яны былі абмежаваны ў сваіх правах ў параўнанні з паўнавартаснымі абшчыннікамі – мужамі. Звяртае на сябе ўвагу той факт, што сяляне, перад тым, як пайсці з вёскі, звычайна папярэджвалі свайго пана аб тых ці іншых праблемах, якія ў іх былі, прасілі паменшыць павіннасці ці ўціск з боку аканамаў ці арандатараў, бо заяўлялі, што ў адваротным выпадку яны хоць не хочуць, а вымушаны будуць пайсці з вёскі. Сяляне добра ўсведамлялі, што калі пойдуць са сваёй вёскі і адмовяцца ад нажытага, то хутчэй за ўсё будуць ужо не гаспадарамі, а жабракамі.

Пакаранне выгнаннем і надалей будзе прысутнічаць пры разборы сітуацыі ў Азярышчанскай воласці, а ў дадзеным выпадку кароль папярэдзіў бунтаўнікоў, каб выконвалі ўсе распараджэнні, «заказнікаў і дзесятнікаў, а калі яны будуць прыцягваць да работы, біць іх не адважваліся, а бунтаўнікоў, якіх паводле нашага (каралеўскага – *В.Г.*) дэкрэта будуць караць і з воласці выганяць, не баранілі (значыць баранілі! – *В.Г.*)». [12, Dz. X, sign. 308, p. 10]. Зусім верагодна, што ў некаторых выпадках, можа і ў большасці, дзяржаўныя падданыя ў якасці пакарання перадаваліся ў рукі прыватных феадалаў, у маёнтках якіх простае насельніцтва не мела такіх правоў, як у гаспадарскіх уладаннях. Сведчаннем таму ёсць справы аб адданні яшчэ ў 1625 годзе, на пачатку барацьбы, у прыватныя ўладанні падданых, якія ўцяклі з Азярыцкага староства ад пакарання і былі злоўлены [12, Dz. X, sign. 305, p. 8].

Дынаміка падзей прасочваецца з тэкста наступых каралеўскіх грамат. Грамата Уладзіслава IV ад 28 лістапада 1644 года была адрасавана «баярам путным і падданым цяглым староства нашага Азярыцкага» і папярэджвала, што ў староства высылаюцца рэвізоры для праверкі рэальнай колькасці зямлі ў баяр, дакладнага вымярэння 30 валок для баярскай службы і ўстанаўлення з іх павіннасцей, а таксама для выслухвання крыўд і скаргаў як з боку старасты Азярыцкага, «так і таго, што вы да старасты прэтэндуеце» [12. Dz. X, sign. 308, p. 17].

Хутчэй за ўсё воласць, простыя сяляне пасля пагрозаў і націску не выказвалі больш такой шырокай падтрымкі баярам, як раней. Наступная каралеўская грамата ад 3 ліпеня 1645 года была адрасавана ўжо толькі баярам путным. У ёй сцвярджалася, што апошнія працягваюць бунтаваць і не выконваюць павіннасці, не захацелі прыняць каралеўскіх камісараў, зноў пабілі абшчынных старцаў і іншых людзей, якія адмаўляліся быць іх памагатымі [12. Dz. X, sign. 308, p. 26]. Больш за тое, баяры працягвалі адмаўляцца хадзіць на будаўніцтва замка і адпраўляць, як было загадана «па дзесяць чалавек на тыдзень сцерагчы альбо пехатою з пушкамі на ім быць васемнаццаці чалавекам». Кароль папярэджваў баяр, каб не баранілі двух бунтаўнікоў, якія былі прысуджаны «на публічнае біццё і на пакаранне выгнаннем з воласці, а таксама другіх вінаватых не баранілі» [12. Dz. X, sign. 308, p. 26].

Справа, натуральна, скончылася перамогай дзяржавы і над прадстаўнікамі баярства, і над тымі сялянскімі абшчынамі, якія сімпатызавалі першым, падтрымлівалі ў знак аднадумства і сялянскай салідарнасці. Аб тым, што такая абшчынная салідарнасць была, у першую чаргу сведчаць пастаянныя папярэджанні сялянаў з боку ўраднікаў аб тым, каб яны не падтрымлівалі тых, хто не згодны з уладамі. Да таго ж, нам удалося знайсці сведчанні, як на самой справе сяляне, цэлыя сялянскія абшчыны адносіліся да тых, каго ўлады называлі бунтаўнікамі. Так, напрыклад, згодна аднаго з данясенняў, 16 сакавіка 1625 года судовы выканаўца Полацкага ваяводства «енерал» Ян Бедыцкі «до звышменованой данины Невельской прозываемой Неречова зьезджал и заставшы там подданых нашых Езерыцких имены в той реляцыи вписаных, выданья их упоминал я, *тогды старец и иншые поданые тамошние* (выдзелена мною – *В.Г.*), не только збегов не выдали, але и его возного шляхетного … бить хотели, грозячыся на них словы уфытливыми лаяли …» [12, Dz. X, sign. 305, p. 9].

Справа «Аб бунтах баяр староства Азярыцкага» скончылася ў 1646 годзе. Як паведамілі каралю камісары, баярына Грышку Логвінава «за бунты і за тое, што неўчцівы… і воласць ізноў да бунту вёў» пакаралі «на сыпанне валу ў замку Азярыскім у аковах цэлыя паўгады» [12, Dz. X, sign. 308, p. 30]. Больш за дзесяць чалавек былі пакараны за тое, што выбіралі сабе старшых і дзесятнікаў без ведама старасты Азярыцкага. Васіля Каваля, Цімошку Пшаніцу, Дмітра Хадонка, Хаму Дзітравянка, Аляксея Кузка, Лазука Аўсяніковіча, Івана Шупіка і Данілу Друка, якія прымалі актыўны ўдзел у бойках і забойствах, камісары рэкамендавалі пакараць на смерць, але кароль прысудзіў на публічнае біццё і сыпанне валу ў замку Азярыцкім на цэлы год у аковах. Баяр з вёсак Уса і Вайхані прысудзілі на дванаццаць тыдняў насыпання валу, а калі яны «выконваць гэтага не захочуць, тады за гэтую віну будуць пакараныя на горла, альбо на публічнае біццё і выгнанне з воласці» [12. Dz. X, sign. 308, p. 31]. Шмат людзей атрымала некалькі меншыя пакаранні. Такім чынам, улада жорсткім чынам спыніла праявы людской самастойнасці і супраціву. Галоўным аказалася нават не пакаранне, а тое, што дзяржава дабілася свайго. Хоць у ланцугах, а на будаўніцтва замка непакорныя пайшлі. Усім астатнім паказалі, што і адмова ад выканання павіннасцяў, і спробы грамадскай самаарганізацыі, выбары кіраўнікоў абшчыны без дазволу ці ведама адміністрацыі староства будуць строга пакараныя.

Разам з тым адзначым, што ў гэты ж час улады шукалі і іншыя шляхі вырашэння праблемы з беспрабойным функцыянаваннем замкавай службы. Папросту на службу набіралі новых людзей. Так, напрыклад, 3 мая 1636 года Уладзіслаў IV даў шляхтічу Аляксандру Мерацкаму правам дажывотным вёску

PolotskSU



Арлее (Орлее) Азярыцкай воласці «каб ён служыў для абароны замка таго Азярыцкага» [13, р. 253]. Вось такую старонку з рэальнага жыцця насельніцтва Азярышчанскага краю ў першай палове XVII стагоддзя мы паспрабавалі аднавіць на аснове архіўных матэрыялаў. Матэрыялы гэтыя сведчаць як пра асаблівасці пагранічнага становішча ўсходняга рэгіёну Беларусі, так і пра дастаткова шырокія правы насельніцтва тут, існаванне сялянскай абшчыны з яе салідарнасцю. Выразна відаць і імкненне ўладаў поўнасцю ўзяць абшчыну пад свой кантроль.

Разважаючы пра лёс арганізацый сялянскага самакіравання ў Беларусі XVI – першай паловы XVII стагоддзя немагчыма абмінуць своеасаблівасці іх існавання ва ўсходнім і заходнім рэгіёнах. Захад і ўсход Беларусі пачалі значна розніцца паміж сабой па ролі і месцы абшчыны ў сацыяльна-эканамічным жыцці сялянства і ўсяго грамадства галоўным чынам з часоў правядзення валочнай памеры. Разам з тым засталіся і агульныя элементы абшчыннай арганізацыі на захадзе і ўсходзе Беларусі. Разам з правядзеннем валочнай памеры і звязанай з ёй індывідуалізацыяй сялянскага гаспадарання, своеасаблівым паказчыкам аднастайнасці абшчыннай арганізацыі захаду і ўсходу Беларусі стала воласць. Справа ў тым, што як на захадзе, так і на ўсходзе асобныя сельскія абшчыны афіцыйна былі ўключаны ў склад значна большых тэрытарыяльных арганізацый – валасных абшчын ці проста «воласцей». Калі ў 60 – 70-я гады XVI стагоддзя фактычна завяршылася афармленне адміністратыўна-тэрытарыяльнага падзелу дзяржавы (ваяводства – павет), «воласць» як тэрытарыяльная адзінка ў большасці выпадкаў стала супадаць з воласцю-абшчынай. Тут выразна назіраецца як імкненне дзяржавы ўключыць грамаду ў афіцыйна сфармаваныя адміністратыўна-тэрытарыяльныя структуры (воласці), так і вымушанае прызнанне ўладамі права грамады на існаванне як самаарганізаванай грамадска-тэрытарыяльнай супольнасці. Воласці ў гэты час, па трапнаму выразу В. Насевіча, з'яўляліся асноўнымі структурнымі адзінкамі грамадства і дзяржавы [14, с. 56].

З XVI стагоддзя тэрмін «воласць» абазначаў не толькі грамадскую структуру, якая размяшчалася на пэўнай тэрыторыі, а таксама саму гэтую тэрыторыю як адміністрацыйна-тэрытарыяльную адзінку. Да таго ж, тэрмін «воласць» стаў тэрмінам фіскальным, прызначаным ужо не для індывідуальнага, а для калектыўнага, грамадскага абкладання. Якраз на воласць, валасную грамаду прызначаліся сумесныя поплаты і даніны на карысць дзяржавы ці асобных феадалаў. Увядзенне валокі спрыяла большай індывідуалізацыі насельніцтва, у першую чаргу ў справе павіннаснага і падаткавага абкладання. Валасная прывязка, наадварот, узмацняла абшчынныя традыцыі, а дзяржава з яе дапамогай гарантавана атрымлівала падаткі.

На жаль, не выяўлена ніводнага дакумента, які б дэталёва раскрываў унутраную арганізацыю воласці (*хутчэй за ўсё такой аднастайнасці і не было)*. Абсалютная большасць даследчыкаў, якія займаліся пытаннямі жыцця сельскага насельніцтва і адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання ВКЛ, прыходзілі да думкі, што воласці, у прыватнасці ў XV – XVI стагоддзях, уяўлялі сабой адначасова адміністрацыйна-тэрытарыяльныя, гаспадарчыя і падаткавыя адзінкі, у межах якіх нават пасля правядзення вялікай аграрнай рэформы XVI стагоддзя працягвала функцыянаваць абшчына як форма сацыяльнай, тэрытарыяльнай і, у пэўным сэнсе, эканамічнай арганізацыі сельскага насельніцтва [10, 15 – 18].

Воласці ў пераважнай большасці належалі вялікаму князю (гаспадару) і як дзяржаўная ўласнасць процістаўляліся вотчыне – уладанню на правах прыватнай уласнасці [19, с. 350]. Разам з тым у крыніцах сустракаюцца факты перадычы воласці ў вотчыну (1470 г., вялікі князь аддаў «Баце волость Свадитов у вотчину» [5, р. 45]. Адзначым, што былыя дзяржаўныя воласці, якія былі перададзеныя гаспадаром прыватным ці царкоўным уласнікам, з цягам часу звычайна страчвалі свае «абшчынныя» паўнамоцтвы, але так было не скрозь і не заўсёды. Так, напрыклад, у былых гаспадарскіх Стрэшынскай і Горвальскай валасцях, якія былі падараваны Віленскаму каталіцкаму біскупству, грамада працягвала існаваць на працягу XVII і XVIII стагоддзяў [20].

Назва «воласць», у разуменні «абшчына», у дакументах XVI стагоддзя сустракаецца значна часцей, чым «грамада». Хутчэй за ўсё, пасля ўсталявання ў ВКЛ адміністрацыйнага падзелу краіны на ваяводствы і паветы тэрмін «воласць» захаваўся ў асноўным для абазначэння сельскай абшчыны як грамадскай, падаткавай і адміністрацыйна-тэрытарыяльнай (у складзе павета, староства, эканоміі) структуры.

Сапраўды, воласці знаходзіліся галоўным чынам у складзе тых дзяржаўных, прыватных ці царкоўных уладанняў, дзе сялянская абшчына не проста працягвала існаваць, але была прызнаная феадальным уласнікам, што было зафіксавана і ў дакументах. Тэрыторыя, якую займала воласць, з цягам часу магла мяняцца, у рамках адной воласці маглі з'яўляцца новыя абшчыны-воласці, частка воласці магла змяніць свой статус у выніку гаспадарскіх падараванняў і інш.

Валасныя абшчыны звычайна называліся па назве цэнтра воласці – горада, мястэчка, сяла, гаспадарскага двара. Валасная грамада мела ўласную адміністрацыю (старцы, іх намеснікі, у некаторых мясцовасцях соцкія і дзесяцкія), самакіраванне ў арганізацыі грамадскага і гаспадарчага жыцця вёскі, упарадкаванныя нормы і правілы паводзін паводле старыны і традыцыі. Землеўласнік, а тым больш дзяржава пазбягалі залішняга ўмяшальніцтва ў жыццё вёскі. Ім было выгодна, каб пытанні, якія не тычыліся непасрэдна выканання павіннасцяў і аддавання чыншаў і данін вырашаліся сялянамі самастойна, без іх умяшальніцтава, без затраты сродкаў і часу. Сельскія абшчыны мелі нават сваю судовую арганізацыю (копны суд), якая была афіцыйна прызнаная дзяржавай. Цікавасць уяўляе тое, што гэты суд распаў-

PolotskSU



сюджваў свае паўнамоцтвы на тэрыторыю некалькіх суседскіх абшчын, што несумненна сведчыла аб яго даволі глыбокіх гістарычных каранях.

У разглядаемы час насельніцтва, якое ўваходзіла ў склад тэрытарыяльнай (валаснай) грамады, называлася «мужамі», «людзьмі», «валашчанамі», ці па адміністрацыйнаму цэнтру воласці «азяране», «магілёўцы», «мазыране», «палачане». Сяляне, якія жылі ў гаспадарскіх валасцях (валашчане), члены грамады, валодалі больш шырокімі правамі і мажлівасцямі, чым сяляне прыватных маёнткаў. Па-першае, сяляне дзяржаўных уладанняў мелі права падаваць скаргі на імя вярхоўнага ўласніка, гаспадара, чым шырока карысталіся. У матэрыялах Метрыкі ВКЛ захаваліся як скаргі гаспадарскіх сялян, так і адказы на іх. Большасць скаргаў зыходзіць якраз ад валаснай грамады. Так, у 1563 годзе ў адказ на скаргу валашчан і мяшчан Барысаўскіх Жыгімонт Аўгуст вызваліў іх «от даванья подвод даремных и от подыймованья панов гетманов и послов великих и гонцов наших, также послов и гонцов московских... ведаючи же межи Борисовскими помера в/о/лочная и устава платом достаточная вже постановена есть, с которое и на подводы дают...» [29, А. 379 адв.]. Па-другое, з сялянамі, арганізаванымі ў грамаду, лічыліся нават феадалы. Дзяржаўныя сяляне часта спрачаліся з велікакняжацкімі намеснікамі і даказвалі свае правы. З валашчанамі Рэчыцкага гаспадарскага замка з сяла Ліпінічы ў прысутнасці мясцовай шляхты ўзгадняў межы атрыманага грунта каралеўскі дваранін пан Андрэй Длугабаньскі: «Поведал теж мне старец Липницки Андрей Жолуд и вси подданые липиницкие перед сторонами людьми добрыми шляхтой, иж тая земля од них отделена» [21, Sign. 19, p. 10].

Вядомы шматлікія выпадкі, калі сельскія абшчыны, спрачаючыся за зямлю ці сенажаці, пераходзілі да сілавога супрацьстаяння. Нярэдкімі былі выпадкі «наездаў» вясковых абшчын на чале са старцамі (часта з ініцыятывы мясцовых ураднікаў) на суседнія грамады, ці чужыя прыватнаўласніцкія вёскі і рабаванне іх. Напрыклад, аб такім выпадку апавядае скарга на пана Івана Федаравіча Быкоўскага, ураднікa бабруйскага, які 6 чэрвеня 1582 года з «мещаны бобруйскими помочниками своими, а з волости Бобруйское половицы Виленское старца волосного найме Якова Вороновича з села Демидович… и зо всими волощаны тое половицы Виленское и з иншыми многими помочниками своими з ручницами, з рогатинами, з сагайдаками и з иншгыми военными бронями моцно кгвалтовне наслал на власное его мсти… прозываемое Зубаревичи» [12, Dz. X, nr. 99, p. 1].

Найбольш распаўсюджаным найменнем кіраўніка абшчыны было «старац», але ўжо ў XVI стагоддзі з'яўляюцца новыя назвы. У Магілёўскай воласці было два старцы: мядовы і сярэбраны, верагодна, у залежнасці ад таго, за збор якой даніны ён нёс адказнасць. Цікава, што ў магістрацкіх кнігах Магілёва за 1579 год кіраўнікі валасной абшчыны названыя «на гарадскі лад» (*В.Г.*) «войты волосные», «войты волощаны волости Могилевской». Гэта звязана з тым, што ў тых уладаннях, дзе прайшла валочная памера, на чале абшчыны замест старца ставіўся войт, які станавіўся кіраўніком абшчыны, але, будучы прызначаны ўладамі, адначасова з'яўляўся і прадстаўніком адміністрацыі ў вёсцы ці воласці.

Часта за права выбару старца абшчыннікі былі абавязаны плаціць спецыяльныя поплаты, так званае «старчэнне». У 1536 годзе вялікі князь Жыгімонт Стары ў адказ на прызначэнне дзяржаўцаю старца без згоды на тое магілёўскіх валашчан даў распараджэнне аб прызначэнні старцам іншай асобы: «чоловека доброго, а годного, кого волость похочет» [10, с. 21]. У некаторых выпадках землеўласнік імкнуўся поўнасцю забраць сабе права прызначэння кіраўніка абшчыны, як то зрабіў вялікі князь Жыгімонт Аўгуст у двух ідэнтычных граматах ад 14 ліпеня 1547 года, адрасаваных «старцом и всим под/данны/м» суседніх Чачэрскай і Прапойскай гаспадарскіх валасцей у адказ на скаргі насельніцтва на дзяржаўцу пана Юрыя Мікалаевіча Зеноўевіча. Вялікі князь адзначыўшы, што валасныя людзі без ведама вялікакняжацкага намесніка, згаданага дзяржаўцы, «сами межи собою старца обравши», не здалі дзяржаўцу ўсё прызначанае палюддзе і яшчэ хочуць самі збіраць «мыто воденое от гостеи», адназначна заявіў: «Ино што ся дотычит мыта и выбираня старца, то ест реч наш/а/ г/оспо/д/а/рьская, а не в/а/ша хлопская» [22, с. 38]. Устава дварам гаспадарскім Віленскага і Троцкага паветаў 1542 года так піша пра выбары абшчыннай адміністрацыі: «Теж, абы державца дворов нашых, врадники дворныи: яко заказники, старцы, тивунове, приставы, сорочники, гуменники обирали, што лепшыи мужы верныи, а которыи бы большей стерегли роботы, пашне и инных…» [23, с. 210].

Валасныя старцы прадстаўлялі сваю воласць у дачыненнях з гаспадаром і яго намеснікамі, іншымі феадаламі і ўраднікамі. Менавіта на імя старцаў у першую чаргу адрасаваліся велікакняжацкія граматы, адказы на скаргі валашчан: «Старцом и всим людем волости н/а/шое Чечерское», «Старцом и всим людем волости н/а/шое Пропоиское» [22, с. 37, 39]. Менавіта старцы збіралі сялян на абмеркаванне грамадскіх пытанняў, на правядзенне копнага суда. Часта скаргу падавалі не на саму абшчыну, а на яе кіраўніка. Так, дзяржаўца Віцебскай плябаніі Мікалай Дзеражынскі падаў у 1550 годзе скаргу ўраду гаспадарскага двара Чарсвяты на старцаў Бялянскіх «напервей на старца пана Ивана Сопеги… именем Лукьяна Сухога, на другого старца… Степана Пушкаря, на третего старца… Ходора Каркуна. Тыи деи старцы з людми панов своих и з многими помочниками своими нашодшы кгвалтом на имене плебанеи Витебское Лепле..» [24, p. 1].

З умацаваннем гаспадарчага і палітычнага жыцця звычайна пачынаўся наступ уласнікаў на абшчыну як на інстытут самаарганізацыі сельскага насельніцтва – спроба поўнасцю падпарадкаваць абшчыну волі ўласніка. Гэта дасягалася рознымі спосабамі. У першую чаргу дзяржава імкнулася рэгуляваць дзей-

PolotskSU



насць грамады законам, часта адмяняючы яе традыцыйныя правы (выбары старца, расклад павіннасцей, сумеснае карыстанне зямлёй і г.д.) і ўводзячы новыя правілы («навіны»), паводле якіх грамада набывала рысы не самакіруемай арганізацыі насельніцтва, а органа, прызначанага ў першую чаргу для выканання распараджэнняў феадала. Як ужо адзначалася, часцей за ўсё гэта адбывалася праз імкненне трымальніка прызначыць сялянам кіраўніка абшчыны – старца ці войта. Але нават і ў такой напаўпадпарадкаванай сітуацыі абшчыне часта ўдавалася адстойваць свае традыцыйныя правы ў змаганні з землеўласнікам. Таксама і ў старцаў, што знаходзіліся ў становішчы ўраднікаў, якіх адначасова прызначаў феадал і выбірала грамада, з'яўлялася магчымасць зрабіць нешта для сваёй грамады, дапамагчы некаму з абшчыннікаў. У спрэчных выпадках селяніна з дзяржаўным чыноўнікам кіраўнік абшчыны звычайна займаў бок падданага. Верагодна, тут ізноў спрацоўвала сялянская салідарнасць. У таго ж старца ў вёсцы жылі родзічы, уклад яго жыцця не адрозніваўся ад уклада жыцця ўсёй вёскі. Натуральна, што ён таксама добра разумеў, што калі грамада выкажацца супраць яго кандыдатуры на наступных выбарах, то і землеўласнік на гэтым настойваць не будзе, таму што ў такіх выпадках стаўка рабілася на асобу, якая прымалася абодвума бакамі.

Значную ролю ў жыцці сялянства на ўсходзе Беларусі адыгрывала традыцыя і звычаёвае права гаспадарскае. Іх роля заставалася даволі важнай і пасля з'яўлення пісаных законаў і правіл, тым больш што сельскае насельніцтва ў той час у абсалютнай большасці было непісьменным і не магло б шырока скарыстацца пісанымі нормамі. Традыцыя (звычаі, парадкі, правілы, якія складваліся ў сацыяльнай і гаспадарчай дзейнасці, арганізацыі побыту, грамадскага жыцця і працы сельскага насельніцтва здаўна, на працягу доўгага перыяду часу і перадаваліся ад аднаго пакалення да другога), ці, як тады гаварылі, «старына», і звычаёвае права на працягу доўгага часу, па меншай меры і ў XVI – XVIII стагоддзях, прызнаваліся дзяржавай і вызначалі многія палажэнні сацыяльнага і гаспадарчага жыцця сельскага насельніцтва. Праўда, паступова яны і самі змяняліся, прыстасоўваючыся да абставін ці запатрабаванняў улады. Традыцыя распаўсюджвалася на самыя розныя сферы жыцця і разумелася менавіта як непарушнае звычаёвае права [25, с. 529]. Галоўным лозугам прынцыпа старыны было велікакняжацкае «мы новин не уводим, а старин не рухаем» [26, с. 595 – 596]. З цягам часу новаўвядзенні, «навіны» самі станавіліся «старыной», ператвараліся ў традыцыйныя правілы, стандарты дзейнасці і паводзін. Шмат такіх сведчанняў захавалася ў Метрыцы ВКЛ, судовых справах, разнастайных матэрыялах з архіваў феадальных уладанняў.

Так, напрыклад, вялікі князь Аляксандр у лісце да Віцебскага намесніка ад 11 красавіка 1495 года ў адказ на скаргі насельніцтва заявіў: «приказуем тобе, штобы еси им через то больш кривд не чинил, и новин не уводил, и делал бы все по старому, как будет первей того бывало за предков наших и за отца нашого…» [27, с. 151]. Вядомая грамата вялікага князя Жыгімонта ад 2 кастрычніка 1511 года, выдадзеная ў адказ на скаргі насельніцтва гаспадарскіх Падняпроўскіх і Задзвінскіх валасцей «т.е. с Кричова, с Пропойска, с Чечерска, с Горволя, с Речицы, с Брягина, с Мозыра, с Бчича, с Бобруйска, с Свислочи, с Любошан, с Усвята, с Озерищ» аб тым, што пры выбары даніны, яе зборшчыкі прыходзяць у валасці з войскам, «их ницуют и грабят; а наболей отяжают собе од писарей наших, которых жо посылаем по тым волостем нашим недополнков даней наших правити, иж слуги их, от году до году, не выезжаючи на тых волостех мешкают, корчмы сытят для своего пожитку, а волости наши мусят им на каждую неделю страву давати грошми и стацеею…» [4, с. 188], таксама пацвердзіла па просьбе насельніцтва старыну. «И били нам чолом вси тых волостей наших данники наши, абыхмо их при старине зоставили, как бывало за предков наших, за вел. кн. Витовта и Жикгимонта, иж они сами, собравши дань грошовую, и бобры, и куницы, отношивали до скарбу нашого, а мед пресный до ключа; и подвязалися нам тым обычаем штож всю тую дань нашу, грошовую, и медовую, и бобровую, и куничную, мают нам относити до скарбу и до ключа нашого, всю сполна, подле стародавнего обычая...» [4, с. 188]. Вялікі князь пайшоў насустрач сялянам «с паны радами нашими помысливши о том, и бачучи их слушную прозьбу, которая ж есть з нашим пожитком, тым есмо их пожаловали…» [4, с. 188]. Пазней, калі ў 1535 годзе жыхары тых жа Усвяцкай і Азярыцкай валасцей паскардзіліся вялікай княгіне Боне, на тое, што віцебскія ўраднікі пачалі іх «пад свой прысуд да Віцебска вярнуць», то рашэнне ўласніцы было прынята ізноў на карысць валашчан якраз са спасылкай на старыну, паводле якой у адносінах да вышэйназванага насельніцтва не маюць права «ани пан воевода витебский, ани его врядники витебские ни судити, ни радити...» [4, с. 195].

Традыцыйна на ўсходзе не мяняліся не толькі формы сялянскага землекарыстання і збору падаткаў, але і асноўныя прынцыпы функцыянавання сялянскай абшчыны. Напрыклад, пасля таго, як у 1536 годзе насельніцтва Магілёўскай воласці паскардзілася вялікаму князю на тое, што трымаўца воласці, князь Васіль Саламярэцкі, не толькі падвысіў павіннасці, але і сам прызначыў у воласць кіраўніка грамады – старца, гаспадар запатрабаваў, каб Саламарэцкі «учинил справедливость во всех речах» «подле давнего обычая» [10, с. 5].

Паказальна і тое, што ў разглядаемых намі валасцях захоўвалася старажытная традыцыя выбараў насельніцтвам кіраўніка грамады – старца. Калі вышэйзгаданы князь Саламярэцкі прызначыў у Магілёўскай воласці ў 1536 годзе старцам свайго стаўленіка Якава, які рабіў людзям крыўды, гаспадар запатрабаваў выбрання іншага, «чоловека доброго, а годного, кого волость похочет и который бы за людми стоял» [10, с. 5]. У Барысаўскай воласці ў XVI стагоддзі сяляне па традыцыі валодалі правам выбара старца, але вялікакняжацкі намеснік паспрабаваў абмежаваць яго, беручы за гэтае права спецыяльную плату [10, с. 5].

PolotskSU



На чале Любашанскай валасці таксама знаходзіўся старац, якога выбіралі прадстаўнікі (ці старцы) асобных вёсак валасці: «Мы, мужы Любошанцы, с порученья всея волости Любошанское вызнаваем сим нашим листом, – Ясь с Кекерова, Панко с Стоял, Мышко с Кожыч, Слуц высоки. Симон з Суши, Сорока з Хочич, Дорош Старынчич, Платон з Варикошич, Иван з Далеп, Семен Старынчич, Андрей Хороховский з Добрылович, Фома Мас с Добрилович, Данило Сланкович з Далеп, Мокей с Високих, Илейка с Бросневич, Толстый з Довгоед, Селивон, старец, з Лешницы, Прыкрый в Любошанех, Овсей Семенович з Любошан – обобрали есмо восполок старцом чоловека волости Любошанское ж на имя Селивона Хласовича (9 сакавіка 1500 года)» [10, с. 5].

Адным з асноўных паказчыкаў існавання і функцыяніравання грамады з'яўляецца яе ўдзел у арганізацыі землекарыстання і выплаты падаткаў і выкананні павіннасцяў. У разглядаемы час сялянская грамада ў гаспадарскіх валасцях усхода Беларусі паступова страчвала магчымасць поўнасцю самастойна праводзіць раскладку і збор падаткаў. Напрыклад, у 1533 годзе вялікі князь так пісаў пра ўдзел старцаў у раскладцы павіннасцяў: «Иж старцы тых разметов сами вжо не мають на волости метати, нижли. Коли, на их потребу волостную пенязей потреба вкажет, тогды они мают, зволившися вся волость и весполк с старцы объявить то вряднику, а врадник маеть им прыдати вижа, перед которым они вижом мають на всю волость размет кинути так, як бы сума не перевышала, едно толко, сколько бы им на тую потребу пенязей вказывало, и тыи пенязи вжо старец маеть з них выбирати и на тыи потребы давати» [17, приложение № 17, 51, с. 15, 56]. У гэтым тэксце ўтрымліваецца вельмі важная інфармацыя аб тым, што сяляне праводзілі збор грошай унутры абшчыны на агульнаграмадскія патрэбы. Цікавасць выклікае і тое, што такія зборы раней рабіліся грамадой і яе кіраўніком самастойна і, відаць, па патрэбе. Па ўставе Магілёўскай валасці за 1536 год раскладка платаў у грамадзе павінна была рабіцца пад кантролем трымаўцы, як было заяўлена, дзеля таго, каб не абцяжарваць падданства [10, с. 5]. Верагодна, што тут вялікакняжацкая ўлада проста перастрахавалася ад магчымага празмернага ўмацавання грамады, якая магла такім чынам збіраць сродкі для функцыянавання ўласных інстытутаў, тым больш што падобныя выпадкі былі адзначаны ў размешчанай непадалёку Бабруйскай валасці [10, с. 7 – 8]. Разам з тым у суседнім, Крычаўскім, старостве некалькі раней, у 1522 годзе, уладай было пацверджана традыцыйнае права падданства Падняпроўскіх валасцей на самастойны збор даніны [10, с. 5 – 6].

У межах тэрытарыяльна-грамадскіх інстытутаў з назвай «валасць» захоўваліся значныя своеасаблівасці сялянскага землекарыстання, у параўнанні з «безабшчыннымі» валочнымі рэгіёнамі. Шырокія аграрныя пераўтварэнні ва ўсходніх валасцях ВКЛ пачаліся толькі пасля Лівонскай вайны 1558 – 1583 гадоў і завяршыліся прыблізна ў 20 – 30-я гады XVII стагоддзя, значна пазней, чым на захадзе і ў цэнтры. Як ужо адзначалася, адным з асноўных адрозненняў рэформы на ўсходзе было тое, што ў большасці месцаў тут распаўсюджанне ў якасці стандартнага зямельнага надзела і адзінкі абкладання падаткамі і павіннасцямі атрымала служба, блізкая па памерах да валокі. Але ў некаторых месцах працягвалі сваё існаванне даўнейшыя, традыцыйныя адзінкі вымярэння зямлі і найменні зямельных надзелаў. Крыніцы называюць каля дзесятка розных найменняў надзелаў – валока, служба, кадзь, капа, пуд, бязмен, отчына, зямля і інш. Памеры гэтых надзелаў ведала толькі сама грамада, яна прызначала і адпаведныя павіннасці і падаткі з іх. Як ва ўкраінскіх, так і ў беларускіх валасцях у распараджэнне грамады пераходзілі ўсе пакінутыя гаспадарамі землі. Грамада па свайму меркаванню магла сумесна апрацоўваць гэтыя землі, альбо здаваць іх у арэнду пабочным асобам на тых ці іншых умовах. Права сельскай грамады на ўсе землі яе тэрыторыі праяўлялася і ў сумеснай абароне не толькі зямель агульнага карыстання, але і ўласных надзелаў членаў грамады. Асабліва гэта праяўлялася пры спрэчках з сялянамі суседніх вёсак-грамад ці пры спробах захопу абшчынных зямель (з людзьмі ці без) з боку «чужога» ўласніка.

XVI стагоддзе не дае нам прамых сведчанняў аб тым, што грамада поўнасцю перастала ўплываць на працэсы сялянскага землекарыстання. Больш за тое, дакументы сведчаць, што грамада працягвала распараджацца карыстаннем выганамі, лясамі, бабровымі гонамі і рыбнымі ловамі і да т.п. У некаторых выпадках на грамаду ўскладвалася задача асваення і асажвання людзьмі непрынятых надзелаў. Крыніцы сведчаць, што сялянская абшчына ў азначаны час працягвала рэгламентаваць сумеснае карыстанне насельніцтвам сенакоснымі ўгоддзямі, ворыўнымі землямі, якія па розных прычынах не апрацоўваліся, «пусткамі». Так, старцы Дубровенскай валасці ў 1560 годзе былі абавязаны ў адпаведнасці з вялікакняжацкай уставай асажваць незаселеныя землі «водле уставы его королевской милости старец таковые пустовшины осаживать мает» [10, с. 117].

Больш за тое, заўважана, што з канца XVI стагоддзя выразна вылучаецца тэндэнцыя пэўнага аднаўлення абшчынных парадкаў у некаторых дзяржаўных уладаннях. У прыватнасці, сялянскія абшчыны пачалі прымаць у сваё распараджэнне дадатковыя землі (часцей за ўсё пазанадзельныя), сенакосы, якімі карысталіся ўсе жыхары сяла. Арганізацыяй збору і выплаты чыншаў з іх таксама займалася абшчына [7, с. 67]. Зусім верагодна, што феадальнаму ўласніку выгадна было аддаваць гэтыя землі пад калектыўную адказнасць: грамада ў любым выпадку гарантавала выплату поўнай сумы прызначанага чыншу ці дастаўку даніны ў памерах, прызначаных цалкам на валасць. На жаль, крыніцы не даюць магчымасці дакладна прасачыць, як адбывалася раскладка дадатковых зямель у самой абшчыне. Разам з тым адной з галоўных асаблівасцяў у валасцях было тое, што падаткі на насельніцтва і некаторыя

PolotskSU



павіннасці ў многіх выпадках на працягу ўсяго разглядаемага перыяду прызначаліся не на кожнага асобнага гаспадара, а на валасную абшчыну цалкам. Ужо ўнутры воласці адбываўся падзел прызначанай сумы падаткаў на асобных гаспадароў, калі «меты кідалі» і «разрубы чынілі» [10, с. 4 – 5].

**Заключэнне.** На ўсходзе дзяржава не імкнулася поўнасцю разбураць грамаду, наадварот, тут яна падтрымлівалася ў тых межах, наколькі гэта было выгадна ўладам. Дзяржава імкнулася рэгуляваць дзейнасць грамады законам, часта адмяняючы яе традыцыйныя правы (выбары старца, расклад павіннасцей, сумеснае карыстанне зямлёй і г.д.) і ўводзячы новыя правілы («навіны»), паводле якіх грамада набывала рысы не самакіруемай арганізацыі насельніцтва, а органа, прызначанага выконваць распараджэнні феадала. Захаванне сістэмы павіннаснага і падаткавага абкладання цалкам на валасць (тэрытарыяльную абшчыну) у XVI стагоддзі было зручна для дзяржавы, таму што гэта стварала магчымасць хуткага збору даніны і чыншоў і забеспячэння войскаў грашовымі выплатамі, правіянтам і фуражом. Разам з тым абшчына працягвала жыць як арганізацыя сельскага насельніцтва, заснаваная на прынцыпах калектывізму і салідарнасці і імкнулася вырашаць у першую чаргу інтарэсы гэтага насельніцтва.

ЛІТАРАТУРА


1. Пичета, В.И. Юридическое положение сельского населения на частновладельческих землях ко времени издания Литовского статута 1529 г. / В.И. Пичета // Белоруссия и Литва XV – XVI вв. – М., 1961.
2. Похилевич, Д.Л. Статус домена Великого князя Литовского и его населения в XV – XVI вв. / Д.Л. Похилевич // Тез. докл. и сообщ. XV сессии межресп. симпоз. по аграрн. истории Восточной Европы. – М., 1974.
3. Цітоў, В. Падзвінне / В. Цітоў // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 5. – Мінск, 1999.
4. Белоруссия в эпоху феодализма Т. 1. – Минск, 1959.
5. Lietuvos Metrika. Knyga Nr. 3 (1440 – 1498). – Vilnius, 1998.
6. Метрыка Вялікага княства Літоўскага. Кн. 43 (1523 – 1560). – Мінск, 2003.
7. Голубеў, В.Ф. Сялянскае землеўладанне і землекарыстанне на Беларусі XVI – XVIII стст. / В.Ф. Голубеў. – Мінск, 1992.
8. Любавский, М.К. Очерк истории Литовско-Русского государства до Люблинской унии включительно / М.К. Любавский. – М., 1910.
9. Archiwum Główny Akt Dawnych w Warszawie (AGAD), zesp. Archiwum Potockich z Radzynia.
10. Довнар-Запольский, М.В. Западно-Русская сельская община в XVI веке / М.В. Довнар-Запольский. – СПб., 1896.
11. Lietuvos Vastybes Istorijos Archyvas (LVIA). F. 11, ap. 2, bib. 65.
12. AGAD, zesp. Archiwum Radziwiłłów.
13. LVIA. F. 599, ap. 1, bib. 3.
14. Носевич, В. Традиционная белорусская деревня в европейской перспективе / В. Носевич. – Минск, 2004.
15. Владимирский-Буданов, М.Ф. Крестьянское землевладение в Западной России до половины XVI в. / М.Ф. Владимирский-Буданов. – Киев, 1892.
16. Леонтович, Ф.И. Крестьянский двор в Литовско-Русском государстве XVI / Ф.И. Леонтович. – СПб., 1897.
17. Любавский, М.К. Областное деление и местное управление Литовско-Русского государства ко времени издания первого Литовского статута 1529 г. / М.К. Любавский. – М., 1892.
18. Довнар-Запольский, М.В. Очерки по организации западно-русского крестьянства в XVI в. / М.В. Довнар-Запольский. – Киев, 1905.
19. Насевіч, В.Л. Воласць / В.Л. Насевіч, В.П. Панюціч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 2. – Мінск, 1994.
20. Lietuvos Mokslu Akademijos Bibliotekos Rankrašciu Skyrius (LMABRS). F. 43, bib. 8782, 17486, 17487, 17538.
21. AGAD, zesp. Archiwum Doria Dernalowiczów.
22. Социально-политическая борьба народных масс Белоруссии: Сб. докум. и материалов. Т. 1. – Минск: Наука и техника, 1988.
23. Lietuvos Metrika. 6-oji Teismu bylu knyga (1528 – 1547). – Vilnius, 1995.
24. LMABRS. F. 22, bib. 43.
25. Голубеў, В.Ф. Старына / В.Ф. Голубеў // Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 г. – Мінск, 1989.
26. РИБ. Т. 27.
27. АЗР, Т. 1. СПб., 1846.
28. AGAD, zesp. Archiwum Potockich z Jabłonny.
29. Российский архив древних актов (РГАДА). – Ф. 389 (Литовская метрика). – Кн. 290.


*Паступіў 18.01.2007*